БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 10. Менск. Чацьвер 4 красавіка 1918 г. Год I

Менск 4/IV.

Аб «Северо-западном крае».

Новаокупірованную часьць Беларусі можна раздзяліць на Міншчыну з земскім павятовым і цэнтральным губэрнскім самаупраўленем і Віленшчыну. Вілейскі, Дісненскі і кавалак Ашмянскаго павету ніколі ні мелі земства. Ім удалося толькі выбраць валастные земства: іх ні усьпелі селяне паладзіць, як большэвікі іх закрылі, заменіўшы ваенна-рэвалюцыйнымі валасными камітэтамі Стенькі-Разінскаго тыпа с салдацкіх і др. дэпутатоў. Мястэчкі выбралі дэмакратычныя думы, але закон аб функцыях гарадзкога самаупраўленьня, аб падатках і т. д. не прашоў у жыццё. Гэта рэформа так сама на палавіне астанавілася. Хаця трэба сказаць, што мястэчкі выбралі найбольш сваіх беларусоў і жыдоў, «таварышэй» і «земгусароў» папала мала.

У Міншчыне выбары у павятовае і губэрнскае земства былі; у іх разам выбіралі і армія і дзеячы с земскаго саюза: с-ры с.-дэкі, большэвікі расейцы. Кончалася тым, што армія расейская выйшла, але зваены арміі, прэдстаўнікі расейскіх партый, засталіся у павятовых, губэрнскіх земствах, у гарадзкіх думах большых гарадоў. І Беларусь вырабіўшыся з пад апекі наезжых расейскіх чыноўнікоў, папала пад упраўленне больш ідэйных расейскіх абрусіцялеў партыйных людзей з Рязані Ніжняго, Тулы, ці як адзін менскі шут сказаў, «урожэнцаў Земскаго саюза». У нас у Беларусі жывець паміж нас многа рускіх, ці іначэй ўсерасійцаў, яны тут ці радзіліся, ці доўга жывуць, зрадніліся з краем і для яго працуюць, аддаюць свае сілы: сьмешна было бы каб мы, беларусы, агранічывалі іх ні ставілі на асобнае палажэнне. На усебеларускім кангрэсі былі прадстаўнікі стараверoў, каторые колькі вякоў таму назад уцяклі з Масквы ад рэлігійнаго прыціску. Дэлегат ад стараверoў сказаў: «косьці наших дзядоў лежаць тут, і мы тут радзіліся і тут памрэм, доля Беларусі — наша доля».

* * *

У нас зрабілася нейкае фальшывае палажэнне. Беларусы усе сілы укладаюць на адбудову беларускай держаўнасці і адраджэння беларускай культуры, на каторую ціснулі два камні: абрусіцельскі і паланізатарскі.

Быў чорны камень. Скінула яго хваля вялікай рэвалюцыі. Але, зірк, ужо прымасціўся на плечы беларусоў чырвоны камень, каторы робіць з беларусоў тую самую муку што і чорны.

Узяць на сябе беларускае адраджэнне краю самым ідэйным рязанцам і ніжэгародцам досыць цяжка. Цэнтралістычны дух моцны нават у большэвікоў. Іаноу зрабіўся «Северо-западный край» замест «Беларусі». Тым часам маманп беларусы перажываюць гіетарычны, трэба рабіць фундамант жыцця для саўсім новай чыстай беларускай будыніны. Гэта могуць рабіць толькі беларусы, дзеці гэтай зямлі, і тутэйшые людзі, стаячыя на грунце беларускаго адраджэння. Другім спосабам мы ні збярэм беларускай зямлі і народу.

Наша нацыянальная справа для нас вышэй усіх другіх.

Прыгаворы Безштаннікау

Утворэцы праз знаменітаго сатырыка Шчэдрына-Салтыкова расейскі тып «мальца-безштаніка» аднасіўся с пагардай ды непрызнаванем да заходня-эўропэйскаго «мальца-штаніка», як прэдстаўніка «гнілога Заходу", якому толькі расейскі народ може паказаць праўдзівую мэту жыцця, едзіную праўду ды яе сэнс.

Як гэта ён паказаў сьвету —мы бачылі!

У свайей публічнай лекцыі аб чэрні прафэссар петраградзкаго універсытэта Орэст Міллер развіваў думку, што чэрнь могуць складаць ні толькі пакрытые рванём з вопратак бурлакі, але і выбраннікі судьбы у бліскучых золатам мундзірах. За гэтае навуковае адкрыцце, каторае раўно здносіцца як да усялякіх часоў так і да усялякіх пунктоў нашае зямлі, прафэсар Міллер быў выкінуты з універсытэта, дзякуючы стараннян як раз гэтых прадстаўнікаў чэрні, маючых вялікія прывілеі.

Ні так ужо даўно прэдстаўнікі так званнаго парляманту «государственнаго совѣщанія» у Маскве, ні у Пэрсыі у мэджылісе], калі адзін з беларусаў загаварыў аб патрэбі лепшае долі для сваей бацькаўшчыны—Беларусі, аб аўтаноміі у звязі з Расеяй, калі прамовец парушыў іх трухлявае сумленне — прынялі яго сьвістам.

Гэтыя цёмныя паклоннікі ніўформованаго божышча — Інтэрнацыяналу, ненавідзючы нацыяналізм як вузкасць, немру розума: угаварывалі нас, што нашымі кніжкамі ды газэтамі цікавіцца ні варта, што у нас ніхто іх ні чытае, што яны нінатрэбны дай раілі нам і словам і дзелам прыймаць толькі усё расейскае, ні зважаючы на тое, што самі сабе нярэчылі, ужываючы дый навязываючы нам, мусі быць дзеля лепшаго выразумення іх творый, чужую нацыянальную мову, [замест інтэрнацыянальнай[, каторую ні азіраючыся на логіку самі і пашыралі.

Бо самаазначэння гэта толькі здоба да тэорыі для людзей з маладзіка, а жадання праў грамадзянства для усяго, індывідуальна-нацыянальнаго— гэта, па іхняму, [illegible] шкодны ды культурна [illegible]ючы нас забабон, бо кожны з беларусаў у мейсцы свайго жыцельства да у стасунку да гасударства, у яком знаходзіцца. —павінен быць толькі... тутэйшым!

— Тыповые моральные безштаннікі!

Р. З.

З Губэрнскаго Земства.

30 сакавіка Прасьветны аддзел Мінск. Губ. Зем. Управы, склікау да сябе на нараду па школьным справам прэдстаунікоу розных прасьветных установау, профэсіональных і інш. Запрошаны былі і беларусы, а ласьне старшыня і сэкрэтар беларускай прасьветнай суб'комісіі Менск. Гарад. Думы.

Між іншым разважалася справа утверждэння губэрнскаго прасьветнаго камітэту, што будзя загадываць прасьветнаю справаю усяе губэрніі.

Вось-жа пры гэтай справі паустали гарачые дэбаты аб беларушчыну. Подлуг праэкту у склад Губэрнскаго Прасьвет. Камітэту уходзяць: кіраунікі Прасьветнаго аддзелу управы, прэдстаунікі Губэрнскаго Земства, паветовых прасьветных камітэтау, профэсіональных хаурусау, коопэратывоу, 6 чалавек ад настауніцкаго хаурусу і у рэшці па 1 прэдстауніку ад асабліва карысных і чынных таварыствау і інстытуцыяу —як аграномічныя і санітарныя (?) рады, народныя унівэрсытэты, народныя тэатры і інш. (пры чом на гэта патрэбна спэцыяльная пастанова Земскаго Збору). Апроч таго увайходзяць у досыць значным ліку прэдстаунікі нацыянальнасьцяу (каля 15 чал.).

Спрэчка ішла аб тоя, ці у ліку нацыянальных прэдстаунікау павінны быць беларусы, ці не? Член Зем. Управы па прасьвеці п. Злобін і загадчыца аддзелу прасьветы пані Берозова даводзілі, што не, бо, кажуць, беларусы пройдуць ад павятовых земствау і наагул ад усюль, бо яны— большасьць у краю. І ніякімі сіламі нельга было давесьці ім, што гэтая „большасьць" можа ні паслаць нават ніводнаго беларуса, што культурнае і грамадскае жыцце захоплена чужымі, што калі і пройдуць беларусы с правінцыі, дык іщчэ німаведама ці здольны яны будуць і ці захочуць праводзіць у жыцце нацыянальную беларускую школу. Так на том і пастанавілі, што беларусау у камісіі ні трэба. А каб ні было надта крыудна і беларусам, ды глаунае, каб ніхто ні закінуу панам земскім „прасветнікам", што яны па просту руссыфікаторы, дык прыдумалі такую рэч: пры камітэце будзя комісія па беларускай школі. „У гэту камісію мы, кажа п. Злобін, запросім найбольш выбітных дзеячоу беларускай прасьветы. Ім, кажа ніхто ні будзя перашкаджаць працаваць і у камітэці, нават с правам голасу... але толькі у іхніх спэцыяльных справах". Пыталіся беларусы, ці ні можна запрасіць у камітэт прэдстаунікоу беларускіх культурных арганізацыяу. Пан Злобін на гэта атказауі што «чаму-ж, можна, толькі хай яны прэдставяць нам свае адчоты і працы, а тагды мы на гэтым грунце запрапануем Земскаму збору—можа ен і згодзіцца даць ім па мейсцу". Яму атказалі, што кіраунікі прасьветы на Беларусі павінны самі знаць беларускія культурныя арганізацыі, а калі ні знаюць, та павінны аб іх да[...]ведацца. На тым справа [...] скончылася. Беларусы вынесьлі з нарады сумнае пераканание, што пры гэткіх варунках мала надзеі на тоя, што менскія беларусы будуць мець ад новаго камітэту сваю школу.

А. Ж.

Вестi з Расii.

Бюджэт «савецкай рэспублікі»

У Вышэй Радзе народнай гаспадаркі В. Мілюцін рабі[...] наведамленне аб экономічным становішчу Расіі і экономічнаі палітыцэ. У сфэрэ грашова[...] Мілюцін дау такія падрахункі[...]

Па апошнім даным на 1-ое студзеня 1918 году даходы ка[...]сы Дзержаунаго банку за 191[...] год выразіліся у суме 467[...] мільен. рубл. звычайных, што разам з надзвычайнымі дасьць[...] 21960 мільярд. рубл. Выдат[...]кау звычайных было 461[...] мільен. рубл., надзвычайны[...] 332 мільен. рубл. і выкліка[...]ных вайною 22500 мільярд. рубл. Усяго выдаткау зробле[...]на на суму 28503 мільярд. р[...] Бюджэт 1917 г. зроблен з ні[...]дахватам у 6543 міль. рубл[...] Ні можна спадзявацца ка[...] бюджэт 1918 г. змнейшыуся [...] параунанні з 1917 г. але ха[...]рактэр выдаткау будзе інші,— яны будуць рабіцца дзеля па[...] трэб народу.

У сфэры продукцыі стан[...]вішчо Расіі зельмі скрутнае[...] яскравым прыкладам служыць[...] упадак дабычы камяного ву[...]гля. У 1916 годзе вугля даста[...]валося каля 1373 мільярд. пуд[...] а у 1917 г. 1193 мільярд. пуд[...] Продукцыя жалеза зменьшіл[...]ся на 24%, чугуна на 17%[...] Відомая нізначнасьць гэты[...] лічбау робіцца пужаючай к[...]лі рабіць нараунаванне за ме[...]сяцы.

Патрэбы часу вымагаюц[...] устанауленя жалезной дісць[...]пліны працы. Трэба павял[...]чыць прадукцыю і прывоз з-з[...] граніцы уселякай машынэрь[...] Павінен з'ісьціцца плян зл[...]чання коопэратывау с харч[...]вымі арганізацыямі. Ганд[...] мусіць перайсьці з прыватн[...] рук да дзержаучаго.

Будуць утворэны манаполіі на нікаторыя галіны прамысловасьці і гандлю.

«На такую экономічную палітыку нас штурхае само жыцьце» сказау п. Мілюцін.

———

Дзіунае з'явішча.

У Маскве фарміруецца новы Савецкі полк. Штаб палку у адозвах да ахвотнікаў гаворыць: «кажды жаўнер савецкаго палку павінен падчыняцца найстрожайшай рэволюцыйнай дысцыпліне, павінен без нарэкання зносіць усе утрудненія вайсковай службы, ні павінен ставіць жадных патрэбаваньняў»

— Намагаюцца пагаіць тые карэнні, якія самі ад пачатку рэвалюцыі так шчыра калечылі. Позна,—дзерэва памерла.

———

Урадавае прэс-бюро.

У Маскве пры Радзе Народных Камісараў істнуе бюро, мэтай якога ёсьць дастаўленне усім сталічным і у правінцыі «савецкім» газэтам артыкулаў кіраўнічаго характару, а так сама урадавай інформацыі: прыказаў, дэкрэтаў і г. інш. Усе матэр'ялы атрымоўваюцца газэтамі дарма. Працуюць у бюро журналісты толькі с партыйнымі рэкомэндацыямі.

———

«Вольнасьць самаазначэнря» і башкірская «аўтономія».

Бураеўская нацыянальная рада, Бірскаго павету, пастанавіла прыгатаваныя Бураеўскім выкан. камітэтам для арміі 500.000 пуд. хлеба і 300.000 рубл. грашмі лічыць уласнасьцю аўтономнаго району. Служачыя—расійцы, уцякаюць, часьць арыштавана. «За гэту, кажуць «Ізвесція Ц.Ісп. Ком Сов.», безцэрэмонную памаўзлівасьць «аўтономных» бураеўскіх башкірцаў на гасударсьцьвеныя хлеб і грошы, Губэрнскі выканаўчы камітэт совдепаў пасылае у «аўтаномны район моцны вайсковы адзел».

— «І маё маё і тваё маё», кажуць расійскія соцыяльныя добрачынцы.

Пляи окупацыі Сыбіру.

3—16 сакавіка у Пэкіне з учасьцем А. І. Гучкова, быўш. камандзера Чорнам. флота адмір. Колчака і пецербурскаго банковаго дзеяча Путілова была нарада аб окупацыі Сыбіру. Ухвалены быў праэкт паданы Японіяй. Амэрыка, згодна с праэктам, мае стрымаць Уссурыйскую ж. д., а Амурскую—да Іркуцка—атрымоўвае Японія. Кітай займае Маньчжурыю і Палуднёвае Забайкалле, ўключаючы Маймачын, Японія—Прыамурску« обласць з Уладзівастокам. Амэрыка распасьцірае свой уплыў на сыбірскую магістраль і у аддзяку дае абавязак стварыць для Англіі прыязная становішчо у Якуцка—Віцінскім золатаносным районе. Сыбірская магістраль потым будзе адступлена Францыі. за што Амэрыка атрымае нікаторыя пункты у Француzскім Індо-Кітаю. На гэтай жа нарадзе настаноўлена стварыць Урад Дальняго Усходу, катораму памагаць будуць хаўрусьнікі. С членамі скінутаго у Томску сыбірскаго Ураду—соцыялістамі ідуць перагаворы.

———

Сотнікаў і Семеноў.

Гэта правадцы проціў—бальшэвіцкаго казачаго руху у Сыбіру,—Семеноў у Маньчжурыі і Сотнікаў у Краснаярску. Семёноў ішчэ пры Керэнскім, атрымаў пазваленне сформіраваць добравольныя казачыя «ударныя» аддзелы, каторыя накіраваў проці большэвікоў. Спачатку у войску Семёнова былі адны буратамангольцы, але пасьля Іркуцкаго пагрому яно падмацавалося юнкерамі і ахвіцэрамі. Цяпер гэта паважная сіла, с кулемётнай камандай, артылерыяй, браневікамі і нават бранірованым поездам. У апошніе часы сярод ніпрыязных «савецкай» уладзе іменаў з'явіліся імёны адм. Колчака, даўнейшаго нач. забайк. казач. дывізыі генэр. Шыльнікова, даўн. начальн. штаба Іркутск. ваеннаго окр. палкоўніка Нікіціна і інш. Семёнаў карыстаецца помагч Японскаго ураду, каторы памагае яму бронню, грашмі і г. і. Базай бальшэвіцкаго проціў—Семёноўскаго войска з'яўляецца Чыта. аб'яўленая ад 5 сакавіка у ваенным стане. Чыцінскія капіталісты абавязаны выплаціць надзвычайны падатак у тры мільёны руб. Народная рада разагнана. Банкі нацыяналізуюцца. Проціў бальшэвіцкія газэты пазачыняны. Ідуць арэшты «контр-рэвалюцыянэраў».

———

Беларускі тэатр.

У аўторак 2 красавіка «Першым Беларускім Таварыствам Драмы і Камэдыі» на Конскім пляцу у «Беларускай Хаці» былі пастаулены; «Паулінка» Я. Купалы і камэдыя «Міхалка».

Збор быу бадай што ні поуны й артыстау добра віталі. Ігралі пекна, як заўседы, свае ролі у «Паулінцы»; Ф. Ждановіч (Якім) і Янка Беларус (Пранціська). В. Фальскаму (Адольф) ні пашкодзіло б над сваей ролею больш папрацаваць. Панна Мядзіолка (Паулінка) іграла ніц сабе, калі ні лічыць канца у апошнім акце, дзе яна неяк змітусіла апошнія словы. Да таго ішчэ заслона спазнілася, але гэта тэхнічны нідастатак маленькаі сцэны; каб яна была крыху большаю, та скокі так само удаваліся б лепей.

Ні шкодзіло б каб так ужо завучаныя сьпевы: «Чачотачка», «Ці у полі» і інш. выходзілі лепшымі і без зусім ніпатрэбнаго дірыжэрства «пана Адольфа».

«Міхалка», як звычайна, прайшоу пад агульны сьмех. Ф. Ждановіч (Міхалка) і Я. Беларус (Язэп Карыта) вельмі пекныя. Трошкі, здаецца, яны сьпешаліся—ні пашкодзіло б, каб ігралі крыху павальней.

Ад Юлькі (В. Тарасік) можна было б чэкаць больш прастаты, адважнасьці й натуральнасьці.

Адэля (Пралеска) занадта ужо драпежная. Так бегчы праз сцэну можа толькі альбо малое дзіця, альбо жывая карыкатура. Трэ' было б ведаць, што камэдыйнасьць і карыкатура—дзьве рэчы розныя.

Знаемы.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

———

У харчовым аддзеле управлення Л.-Р. ж. д. служачых засталося толькі палова, але і з гэтых, прауду кажучы, пацеха ні вялікая: раз'язные агенты, выехаушые на харчы у Астрахань, Полтаву і інш. месты, прасядзеушы там месяцы, калі каму і зрабілі якую карысьць, то наймені для сваей дарогі...

———

Епіскап Георгі падау скаргу немцам на полякау за перарбоку Івенецкаго жаночаго монастыра на касьцел. Немцы абецалі гэту справу разгледіць.

———

У «Стройзапе» ідзе цяпер выплата пэнсій служачым і рабочым. Колькі удасца выплаціць—будзе залежаць ад тэй сумы, якую выручаць с прадажы інвэнтару, лесу, за каторы ужо узялі 15000 р.; і інш

Пад сьцягам стройзапа «саюз інжэнерау і тэхнікау» колькі мага працуе, каб выясьніць куды дзелося аграмадное багацьце тэхнічнаго інвэнтару з. заходняго фронту і прывясьці яго да парадку.

З гэтых астаткау ужо удалося наладзіць тэхнічную майстэрню. І вельмі карысная гэтай справе найбольш дакладаюць сваей працы інжэнер Дубах і тэхнік Пальцэу.

———

У цэнтральным складзе бышага управлення дарожных работ X арміі з дазволу гарадской управы і камэндатуры ідзе распрадажа астаткау пасьля окупацыі краю прадуктау і жалеза.

Трэба ведаць, што склад з гэтымі запасамі за дзень да прыходу немцау папауся у рукі хуліганау і покуль управа агледзілася—шмат чаго ужо ні стала! аднаго цукру прапала 160 пуд.

Грошы ад распрадажы пойдуць на расплатку з рабочымі.

———

Пачтовые чыноунікі, не спадзеючыся, што можна будзе убіцца у праектаваную земскую почту, бо мейсцау будзе там вельмі мала, уцекаюць з Менска: за імі пасуналося і іх начальства: б. з. начальніка вокругу Нікіфороу і начальнік мінскай п. к. Сіняпупау.

———

У афіцэрскім бюро зарэгістрованых афіцэрау цяпер есьць да 300 Хутка аткрыты будзе 3—і харчовы пункт (Петрапаулоуская, 50), дзе за $1^1/_2$ маркі будуць даваць афіцэрам, вайсковым чыноунікам і дактаром патрэбные на дзень харчовые прадукты, а хто захочэ—гатовы абед.

Пры тым жэ бюро гэтымі днямі аткрываецца і шавецкая майстэрня, дзе будуць рабіць новую і правіць старую вобуу дзесяць спэцыялістау—шауцоу 101-го этапу.

Пасьля еурэйскіх сьвятау у сэмінарыі аткрыецца кравецкая майстэрня (кантракт зробляны с кравцом Рудэрманам). Кошт самой работы будзе прыступны: шынэль—13 р., суконные порткі, ці рубашка—7 р. 30 к., такая самая цана і за летнія—і т. д. Заказы прымаюцца апрача суботы што дня ад 3—$5^1/_2$ г. д.

Афіцэрскае бюро маніцца усіх, зарэгістрованых у ім, запісаць—хто скуль родам, каб ведаць куды каго выпрауляць. Гэта думка прыйшлася і немцам да успадобы.

———

На работы у Гэрманію запісалося ужо больш 2000 душ. Патрэбна 45000. Запіс ідзе далей у духоуным вучылішчы. На дварэ народу—паунюсенька.

———

У воінскаго начальніка тэрмін рэгістрацыі солдатау прыдзецца адлажыць ішчэ раз. Работа ідзе памалу дзеля таго, што да поудня прыймаюць только дакумэнты, а рэгістрацыйныя картачкі з нямецкай печаткай выдаюць пасьля 2-ой г. А найгорш, што паны чыноунікі ні вельмі завінаюцца, ды і прыходзяць пазнавато, а народ мерзне ад газд. 5—6 раніцы.

———

З Александроускай ж. д. служачые дэпо, майстэрняу і станцыі Менск цэлымі кучамі уцекаюць у Маскву, спадзяючыся на расчот у тамтэйшым упрауленні павэдлуг большэвіцкіх дэкрэтау. З аднаго дэпо—дні тры таму назад—выехало чалавек 50.

Калі едуць вялікарусы—дзіва німа, але чаго т уды пхнуцца нашы беларусы? Ці ж бы па салодкія большавіцкія абецанкі?

Тутэйшае начальство пастановіла гэткіх «бежанцоу» назад на службу не прыймаць.

———

Харчовая часьць управлення Л.-Р. ж. д. пасьля уселякіх пробау, каб як наладзіць справу с прадуктамі, пастанавіла пярэхрыстіцца у каопэратыуна—харчовае бюро.

Відаць «як не садзіцеся, а у музыканты не гадзіцеся»...

———

У памешканні «Беларускаго Прэдстауніцтва» у аўторак 2-го красавіка адбыуся установчы сход клюбу «Беларуская Хата». Статут — прыняты; выбрана прауленне.

Таго ж дня, у тым жа памешканні адбылося пасядзэнне «Т-ва Бекарускай Культуры». Справа т-ва шырыцца; праекты і задання—павялічываюцца.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 3 красавіка 1918 року.

ЗАХАД:

Учсамі рухавы артылерыйскі бой ў акрэстнасьці і на поўдзень ад Ленс. На полі бітвы баевая работа на працягу дня абмежавалася артылерыйскаю перастрэлкаю і стычкамі разьведчыкаў. Начная атака некалькіх ангельскіх ротаў каля Айэтт адбіта контр-атакаю.

Дужыя атрады ніпрыяцеля ў вечары атакавалі нашыя пазыцыі паміж Марсэльказ і речкаю Люсь, але адбіты с цяжкімі стратамі.

Мы заўладалі высотамі на поўдня—захад ад Морсейль.

Француzская артылерыя ні накідае разбураць Лаон.

Каля Вердэна і ў Сярэдніх Вогезах ажывілася работа артылерыі.

На поўдня—захад ад Гіцбаха мы шыкоўнай атакою захапалі палонных.

Ротмістр Фрэйгер-фон-Рыхтгофэн здабыў сваю 75 перамогу ў паветры.

На другіх фронтах нічога новаго.

Першы гэнэрал-кватэрмэйстар
фон-Людэндорф.

Своя почта.

———

Пану Н Чаркоцкаму. Ваш артыкул «Што значыц пан, што мужык, а што хам», як завялікая для «Б. Ш.», друкуецца у «Вольнай Беларусі», рэдактар каторай просіць Вас зайсьці на Захароускую 18.

Рэдактар А. Прушынскі.
Выдавецтво Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грыжбляга.